***21 студзеня*** ў 2 “А” класе прайшла цікавая гульня-прагулка “Мы едзем на цягніку”.

У госці да дзяцей завіталі Васілёк і Васілінка. Усе разам адправіліся ў займальнае падарожжа па гарадах Беларусі, дзе дзяцей чакалі прыпынкі: Перакладаем, Прымяняем, Тлумачым, Ужываем. Дзеці адказвалі на пытанні, разважалі, разгадвалі крыжаванкі, выконвалі творчыя заданні, працавалі з рознымі слоўнікамі. Працавалі ў парах, групах, індывідуальна. Пабывалі каля помніка літа- ры Ў.

Усе так былі захоплены, што не заўважылі, як скончыўся ўрок і празвінеў званок. Дзеці зрабілі выснову: наша родная беларуская мова цудоўная, мілагучная!

Пасля ўрока Васілька і Васілінку дзеці запрасілі ў школьную бібліятэку. Усе пазнаёміліся з выставай кніг на беларускай мове, з іх аўтарамі. Асаблівую цікавасць вызваў часопіс “Вясёлка”. Ён так спадабаўся многім дзецям, што яны вырашылі ўзяць яго з сабой і дома працягнуць падарожжа па яго старонках.

Гульня садзейнічала актывізацыі цікавасці да беларускай мовы і літаратуры, дазволіла ўвесці рускамоўных дзяцей у атмасферу жывога беларускага слова, далучыць іх да багацця роднай мовы, адчуць яе прыгажосць, мелодыку.

Настаўніца 2 “А” класа Казачэнка І. В.






